# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПЛЕНУМЕ ЦК КПСС

23 кастрычніка 1984 года адбыўся чарговы Пленум ЦК КПСС.

Пры адкрыцці Пленума з вялікай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш К. У. Чарненка.

Пленум разгледзеў пытанне «Аб даўгачаснай праграме меліярацыі, павышэнні эфектыўнасці выкарыстання меліяраваных зямель у мэтах устойлівага нарошчвання харчовага фонду краіны». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш М. А. Ціханаў.

У спрэчках прынялі ўдзел У. К. Гусеў — першы сакратар Саратаўскага абкома КПСС, А. П. Ляшко — Старшыня Савета Міністраў Украінскай ССР, І. Б. Усманхаджаеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана, Н. А. Назарбаеў — Старшыня Савета Міністраў Казахскай ССР, М. М. Слюнькоў — першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, Н. Д. Цяраэшчанка — старшыня калгаса «Шлях да камунізму» Сцяпноўскага раёна Стаўрапольскага краю, С. К. Гросу — першы сакратар ЦК Кампартыі Малдавіі, М. Ф. Васільеў — міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР, Г. П. Разумоўскі — першы сакратар Краснадарскага крайкома КПСС, В. П. Ніканаў — міністр сельскай гаспадаркі РСФСР, М. Ф. Аксёнаў — першы сакратар Алтайскага крайкома КПСС, П. П. Грышкявічус — першы сакратар ЦК Кампартыі Літвы.

Па абмеркаванаму пытанню Пленум ЦК КПСС прыняў пастанову, якая публікуецца ў друку.

На гэтым Пленум закончыў работу.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 27 (587) | Субота, 27 кастрычніка 1984 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

САВЕЦКІЯ ПРАФСАЮЗЫ! УСЯМЕРНА РАЗВІВАЙЦЕ ПРАЦОЎНУЮ АКТЫЎНАСЦЬ І ТВОРЧУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ ПРАЦОЎНЫХ!

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ САВЕЦКІЯ ПРАФСАЮЗЫ — ШКОЛА КІРАВАННЯ, ШКОЛА ГАСПАДАРАННЯ, ШКОЛА КАМУНІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — БАЯВЫ ПАМОЧНІК І НАДЗЕЙНЫ РЭЗЕРВ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ПЕРАДАВЫ АТРАД МАЛАДЫХ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НЯСТОМНА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ! ПРЫМНАЖАЙЦЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАГА НАРОДА!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

*29-га кастрычніка — Дзень нараджэння камсамола*

## З ІМЕМ ЛЕНІНА НА ПРАЦУ І НА ПОДЗВІГ

Праз дзень моладзь савецкай краіны адзначыць слаўную дату — 66-ю гадавіну з дня нараджэння ВЛКСМ і 60-годдзе прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

Сёння Камуністычная партыя бачыць у Ленінскім камсамоле свайго малодшага таварыша — надзейнага памочніка ў справе пабудовы камунізму. Ленінскі камсамол ўвасабляе на працягу ўсіх гадоў свайго існавання лепшыя рысы маладога пакалення краіны. Юнакі і дзяўчаты з камсамольскімі значкамі на грудзях заўсёды на пярэднім краі, там, дзе цяжка, дзе патрэбны іх працавітыя рукі, малады запал і энтузіязм.

Адна з канкрэтных задач камсамола ў вышэйшай школе — аказваць актыўную дапамогу партыйнай арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў падрыхтоўцы і выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія б валодалі марксісцка-ленінскай тэорыяй, умелі працаваць з людзьмі, былі камандзірамі і арганізатарамі вытворчасці, здольнымі вырашаць задачы камуністычнага будаўніцтва.

Ва універсітэце нямала такіх камсамольцаў, на якіх раўняюцца і бяруць з іх прыклад астатнія студэнты. Мы па праву ганарымся ленінскімі стыпендыятамі — пяцікурснікамі гісторыка-філалагічнага і фізічнага факультэтаў Іванам Афанасьевым і Ігарам Каляскіным, трэцякурсніцай эканомфака Інай Майдановіч, будучымі матэматыкамі Валянцінай Малашанка, Аленай Махновай, Наталляй Цалянчук, Аленай Цімашэнка, купалаўскай стыпендыяткай трэцякурсніцай гістфіла Валянцінай Быхаўцавай.

Адна з надзённых задач Ленінскага камсамола сёння — выхоўваць моладзь у духу камуністычнай перакананасці, савецкага патрыятызму, высокай дысцыплінаванасці, дабівацца таго, каб кожны малады чалавек стаў актыўным будаўніком камуністычнага грамадства. Напярэдадні дня нараджэння камсамола ва універсітэце прайшоў адзіны дзень грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» Гэты дзень стаў сапраўдным камсамольскім святам. На высокім ідэйна-палітычным узроўні прайшла атэстацыя ў камсамольскіх арганізацыях матэматычнага, гісторыка-філалагічнага і эканамічнага факультэтаў. Новая форма работы з кожным камсамольцам ГДУ дае шырокія магчымасці для таго, каб пазбавіцца фармалізму і шаблоннасці ў правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку.

Хутка савецкі народ адзначыць 40-годдзе Вялікай Перамогі над фашысцкай Германіяй. Дастойную сустрэчу слаўнай даце рыхтуюць і студэнты ГДУ сваімі добрымі поспехамі ў вучобе, выдатнай працай. Камсамольцы універсітэта ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 40-годдзя Перамогі за права быць сфатаграфаванымі каля разгорнутага сцяга гарадской камсамольскай арганізацыі.

Амаль кожны трэці студэнт ГДУ ўдзельнічае ў патрыятычным руху моладзі — студэнцкіх будаўнічых атрадах. Тут ён праходзіць выдатную школу працоўнага выхавання, грамадзянскага сталення. У працоўным семестры-84 быў створаны 51 СБА розных напрамкаў, Камітэт камсамола, штаб працоўных спраў падвялі вынікі працоўнага лета. Атрадамі ГДУ асвоена 1.038 тысяч рублёў капітальных укладанняў. Такім чынам, планавая праграма выканана на 119%. Матэматычны факультэт (камандзір штаба працоўных спраў — М. Марчанка) па выніках падрыхтоўчага і рабочага перыяду заняў першае месца ва універсітэце. Сярод лінейных атрадаў лепшымі сталі СБА «Волаты» фізічнага факультэта (камандзір І. Новік), «Арыён» з матфака (камандзір М. Марчанка) і атрад «Памяць» з біялагічнага факультэта (камандзір У. Раньо). У летні працоўны перыяд байцамі СБА універсітэта аказана дапамога 226 ветэранам вайны і працы, адрамантавана і пабудавана 35 помнікаў загінуўшым воінам і партызанам. У год 40-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй байцы будаўнічых атрадаў універсітэта з асаблівымі пачуццямі арганізоўвалі сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, у час якіх выказвалі ім сваю бязмежную ўдзячнасць за іх мужнасць, гераізм у барацьбе з ненавісным ворагам.

Дастойную сустрэчу дню нараджэння Ленінскага камсамола падрыхтавалі таксама асеннія студэнцкія сельскагаспадарчыя атрады, якія аказалі працаўнікам вёскі адчувальную дапамогу на ўборцы бульбы і гародніны. Выдатна папрацавалі на калгасных і саўгасных палетках атрады «Эканаміст», «Біёлаг» і іншыя.

Добрымі справамі сустракае камсамольская арганізацыя універсітэта дзень нараджэння ВЛКСМ. А наперадзе ў яе — новыя здзяйсненні.

**А. КУСЯНКОЎ,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ ГДУ.**

## VII АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

24-га кастрычніка ў актавай зале адбылася VII агульнауніверсітэцкая справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя.

Са справаздачным дакладам, які ў ізлажэнні друкуецца на 2-й старонцы газеты, выступіў старшыня прафкома **М. Н. Мурашка.**

Са справаздачай рэвізійнай камісіі выступіла яе старшыня дацэнт кафедры АМАЭІ **А. А. Скорава.**

У абмеркаванні справаздачных дакладаў прынялі ўдзел: старшыня прафбюро фізічнага факультэта **У. А. Пенязь,** прафгрупорг кафедры педагогікі і псіхалогіі **В. П. Горленка,** дэкан эканамічнага факультэта **У. Д. Арэшчанка,** намеснік старшыні прафбюро матэматычнага факультэта **Г. А. Фрыдман,** дацэнт кафедры хіміі **С. К. Лапіцкая,** старшыня прафбюро геалагічнага факультэта **М. Ф. Паўлаў,** старшы бібліятэкар **Н. Д. Кручкова,** старшыня прафбюро гісторыка-філалагічнага факультэта **Д. Д. Паўлавец,** прафгрупорг кафедры матэматычных праблем кіравання **Г. У. Чарных,** прарэктар па АГР **У. А. Шаўчэнка.**

З дакладам мандатнай камісіі выступіў загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін **А. І. Кіеня.**

Выступіўшыя на канферэнцыі дэлегаты гаварылі аб неабходнасці далейшага ўдасканальвання прафсаюзнай работы ва ўсіх яе звеннях з мэтай якаснага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, пашырэння і павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў, хутчэйшага і больш паспяховага ўкаранення атрыманых вынікаў у вытворчасць. Сур'ёзная ўвага выступаючых была звернута на далейшае ўмацаванне працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, паляпшэнне ўмоў працы і тэхнікі бяспекі.

На канферэнцыі зацверджаны справаздача рэвізійнай камісіі і даклад мандатнай камісіі.

У прынятай пастанове работа прафсаюзнага камітэта за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай. У ёй вызначаны шляхі для дасягнення новых, больш высокіх рубяжоў у ажыццяўленні задач, якія стаяць перад ВНУ краіны на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва.

На канферэнцыі выбраны новы састаў прафсаюзнага камітэта, рэвізійнай камісіі і дэлегаты на XVII абласную справаздачна-выбарную канферэнцыю галіновага прафсаюза.

У рабоце VII агульнауніверсітэцкай справаздачнаа-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі прынялі ўдзел рэктар універсітэта акадэмік АН БССР **Б. В. Бокуць,** прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў,** сакратар парткома **М. І. Старавойтаў,** давераны ўрач ЦК галіновага прафсаюза па Гомельскай вобласці **П. А. Савасцьянаў.**

• • •

Адбыліся арганізацыйныя пасяджэнні новых саставаў прафсаюзнага камітэта і рэвізійнай камісіі. Старшынёй прафкома выбраны **М. Н. Мурашка,** яго намеснікамі — **У. П. Бабына** і **В. А. Каляда,** старшынёй рэвізійнай камісіі — **А. А. Скорава.** Выбраны таксама новы састаў прэзідыума прафсаюзнага камітэта.

## ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СТУДЭНТАЎ

Учора ў актавай зале адбылася студэнцкая справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя. Яе ўдзельнікі заслухалі і абмеркавалі справаздачныя даклады прафкома і рэвізійнаай камісіі, выбралі іх новыя саставы, а таксама дэлегатаў на абласную канферэнцыю галіновага прафсаюза.

Справаздачу аб прафсаюзнай канферэнцыі студэнтаў чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**29-га кастрычніка ў актавай зале ГДУ адбудзецца IX агульнауніверсітэцкая справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя. На парадак дня выносяцца наступныя пытанні:**

**1. Справаздача аб рабоце камітэта камсамола і задачы, якія вынікаюць з пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі», указанняў Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі.**

**(дакладчык — сакратар камітэта ЛКСМБ А. КУСЯНКОЎ).**

**2. Справаздача аб рабоце штаба «Камсамольскага пражэктара».**

**(дакладчык — П. МІНЧУКОЎ).**

**3. Выбары новага саставу камітэта камсамола.**

**4. Выбары штаба «КП».**

**5. Выбары дэлегатаў на XXIII раённую справаздачна-выбарную камсамольскую канферэнцыю.**

**Пачатак работы канферэнцыі ў 10 гадзін 15 мінут.**

**КАМІТЭТ ЛКСМБ.**

*На VII агульнауніверсітэцкай справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі*

# АРЫЕНЦІР — НА НОВЫЯ РУБЯЖЫ

## (СА СПРАВАЗДАЧНАГА ДАКЛАДА ПРАФКОМА)

РАШЭННІ XXVI з'езда партыі, наступных Пленумаў ЦК КПСС, XVII з'езда прафсаюзаў краіны, адзначыў у пачатку справаздачнага даклада старшыня прафкома ГДУ М. Н. Мурашка, сталі канкрэтнай праграмай дзеяння для прафсаюзных арганізацый. Магутнае паскарэнне ўсім справам і імкненням савецкіх людзей надае падрыхтоўка да чарговага XXVII з'езда КПСС. У кожным працоўным калектыве вядзецца настойлівая барацьба за павышэнне эфектыўнасці і якасці работы, за дасягненне найвышэйшых канчатковых вынікаў з мэтай дастойнай сустрэчы слаўнага 40-годдзя Вялікай Перамогі.

Прафсаюзная арганізацыя універсітэта ў справаздачным перыядзе працавала ў адпаведнасці з указаннямі партыі і вышэйстаячых прафсаюзных органаў. Асноўная ўвага ўдзялялася пытанням павышэння грамадскай актыўнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, умацаванню працоўнай дысцыпліны, павышэнню эфектыўнасці ўсёй работы ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, паляпшэння ўмоў працы, быту і адпачынку работнікаў універсітэта.

Прафсаюзны камітэт, які дае справаздачу чарговай VII канферэнцыі, быў выбраны ў саставе 15 чалавек 28 кастрычніка 1981 года. Дакладчык спыніўся на аналізе дзейнасці прафкома і яго камісій. Падкрэслена, што мабілізуючая роля прафсаюзных арганізацый асабліва праяўляецца ў разгортванні і правядзенні сацыялістычнага спаборніцтва. За апошнія гады яно ўзнята ва універсітэце на якасна новую ступень. У гэтым немалую ролю адыграла ўвядзенне кантрольна-планавых паказчыкаў для факультэтаў і кафедр. Адным з важнейшых стаў паказчык па якаснаму паляпшэнню навукова-педагагічных кадраў. Цяпер ва універсітэце з вучонымі ступенямі і званнямі працуе 52 % выкладчыкаў супраць 44 % у 1981 годзе.

Гаворачы аб расстаноўцы кадраў, дакладчык указаў, што на асобных кафедрах яшчэ па сённяшні дзень ёсць вакансіі, значная частка вучэбнай нагрузкі выконваецца пагадзіншчыкамі. Гэта нельга лічыць нармальнай з'явай. Пад кантролем вытворча-масавай камісіі прафкома, прафбюро і прафгруп павінна знаходзіцца размеркаванне вучэбнай нагрузкі на кафедрах. У будучым нельга дапускаць выпадкаў, калі штатныя выкладчыкі асобных кафедр, і ў прыватнасці дацэнты, мелі меншую або на ўзроўні мінімальна дапушчальнай вучэбную нагрузку.

У дакладзе звернута ўвага прафсаюзных арганізацый на неабходнасць большай заклапочанасці аб падрыхтоўцы доктарскіх дысертацый. Патрэбна аказваць дапамогу і праяўляць патрабавальнасць таксама да тых выкладчыкаў, якія даўно закончылі аспірантуру і не прадстаўляюць да абароны кандыдацкіх дысертацый.

Значнае месца ў справаздачным дакладзе адведзена пытанням далейшага павышэння якасці вучэбнага працэсу, больш актыўнага ўкаранення ў яго перадавога вопыту і тэхнічных сродкаў.

Шырока асветлены таксама дасягнутыя вынікі ў навуковых распрацоўках. Разам са станоўчым у гэтай справе ўказана і на недахопы. Сярэдняя аддача на кожны рубель затрат спачатку пяцігодкі раўнялася 1,15 рубля. Гэта крайне мала. Трэба дамагацца, каб кожная навуковая распрацоўка была ўзнята на ўзровень вынаходніцтва, своечасова ўкаранялася ў народную гаспадарку і давала высокі эканамічны эфект.

У СПРАВАЗДАЧНЫМ перыядзе ў полі зроку прафкома, прафбюро, НДС, іншых падраздзяленняў пастаянна знаходзіліся пытанні працоўнай дысцыпліны. Агульнымі намаганнямі ўдалося некалькі ўмацаваць яе. Аднак ва універсітэце па-ранейшаму застаецца высокім ўзровень цякучасці кадраў, асабліва адміністрацыйна-гаспадарчага і вучэбна-дапаможнага персаналу. Ні ў якім разе нельга мірыцца з фактамі парушэння працоўнай дысцыпліны выкладчыкамі. Кожны такі выпадак павінен абмяркоўвацца ў калектывах падраздзяленняў і па іх неабходна прымаць адпаведныя меры.

На жаль, ва універсітэце асобныя выкладчыкі, загадчыкі кафедр і іншыя адказныя работнікі прымірэнча адносяцца да студэнтаў, якія парушаюць вучэбную дысцыпліну. Гэта адмоўна адбіваецца на ўзроўні засваення вучэбнага матэрыялу, што прыводзіць да росту «адсеву» студэнтаў з універсітэта.

Узмацненню арганізаванасці і парадку павінны паслужыць нядаўна зацверджаныя Дзяржаўным камітэтам па працы і ВЦСПС новыя «Тыповыя правілы ўнутранага распарадку для рабочых і служачых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый». Заснаваныя на палажэннях Канстытуцыі СССР, «Закона аб працоўных калектывах», адпаведных пастановах партыі і ўрада, гэтыя правілы заклікаіны садзейнічаць выхаванню рабочых і служачых ў духу камуністычных адносін да працы, умацаванню дысцыпліны, павышэнню якасці работы.

У рабоце прафсаюзнага камітэта і яго вытворча-масавай камісіі важнае месца займалі пытанні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. На факультэтах і кафедрах за яго ходам быў наладжаны сістэматычны кантроль. Гэта дазваляе своечасова аналізаваць дасягнутыя вынікі, бачыць поспехі і пралікі, прымаць меры для няўхільнага выканання абавязацельстваў. Асабліва шмат увагі ўдасканальванню сацыялістычнага спаборніцтва і павышэнню яго дзейнасці надаецца на эканамічным факультэце (старшыня прафбюро — Л. С. Лазучэнкава). На ўсіх кафедрах вядуцца экраны сацыялістычнага спаборніцтва, прафбюро з'явілася ініцыятарам арганізацыі аглядаў-конкурсаў на лепшую вучэбную лабараторыю, на лепшае выкарыстанне ТСН ў вучэбным працэсе, на лепшую пастаноўку дзелавой гульні.

Заслугоўвае станоўчай ацэнкі работа прафбюро матэматычнага факультэта і прафгрупы кафедры палітэканоміі.

Разам з тым, адзначалася ў дакладзе, асобныя кіраўнікі факультэтаў і кафедр стаяць у баку ад арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, спасылаючыся на тое, што гэта — справа прафсаюза. Гэта — беспадстаўныя спасылкі і ў будучым з такім становішчам мірыцца нельга. Неабходна зрабіць папрок і ў адрас работнікаў служб і аддзелаў, якія крайне марудна рыхтуюць інфармацыю для падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Сярод членаў вытворчай камісіі вызначаліся асабліва старраннасцю і заслужылі падзякі А. Ф. Акулевіч і Г. М. Гадлеўская. Яны ніколі не лічыліся са сваім асабістым часам і з вялікай адказнасцю працавалі над аналізам і падвядзеннем вынікаў спаборніцтва.

У дакладзе адзначаліся і недахопы, якія мелі месца ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, указвалася на шляхі іх ухілення. У прыватнасці, прафсаюзнаму камітэту і рэктарату неабходна ўзмацніць увагу да правядзення вытворчых нарад на факультэтах і кафедрах, у лабараторыях і аддзелах.

АДНЫМ з напрамкаў у дзейнасці прафсаюзнага камітэта была работа па стварэнню бяспечных умоў працы, паляпшэнню іх для больш прадукцыйнай працы кожнага члена універсітэцкага калектыву. На сваіх пасяджэннях прафком рэгулярна разглядаў ход выканання калектыўнага дагавару па ахове працы, па гэтых пытаннях заслухоўваў работу факультэтаў, кафедр, лабараторый. Члены камісіі па ахове працы прынялі ўдзел у 11 праверках стану аховы працы ва універсітэце. Многае было зроблена па ўхіленню выяўленых недахопаў. Аднак трэба адзначыць, што прафком яшчэ не дабіўся таго, каб пытанні аховы працы сталі прадметам сур'ёзнага аналізу на пасяджэннях прафбюро, прафсаюзных і вытворчых нарадах.

Праяўляючы пастаянныя клопаты аб здароўі работнікаў універсітэта, адзначалася ў дакладзе, прафком выкарыстоўваў з мэтай прафілактыкі захворванняў розныя формы работы — забеспячэнне пуцёўкамі ў санаторыі, у дамы адпачынку, талонамі на дыетычнае харчаванне. Гэта таксама і заняткі ў спартыўных групах «Здароўе». Аднак, нягледзячы на гэта, колькасць бальнічных лістоў па часовай непрацаздольнасці застаецца вялікай. Аналіз паказвае, што ў большасці выпадкаў бальнічныя лісты выдаюцца па прычыне прастудных захворванняў, таму адным са шляхоў іх скарачэння з'яўляецца падрыхтоўка кожным свайго рабочага месца да работы ў зімовых умовах. У дакладзе адзначалася, што універсітэту мала выдзяляецца планавых пуцёвак у сямейныя дамы адпачынку і пансіянаты, курорты Есентукі, Трускавец і інш. Прафсаюзнаму бюро і прафгрупоргам неабходна шырэй прапагандаваць магчымасць лячэння работнікаў ГДУ без адрыву ад вытворчасці ва універсітэцкім санаторыі-прафілакторыі.

Адным з вострых пытанняў, гаварылася ў дакладзе, з'яўляецца забеспячэнне работнікаў універсітэта жыллём. Прафсаюзнаму камітэту сумесна з рэктаратам і парткомам неабходна прыкласці максімум намаганняў для таго, каб універсітэту выдзялялася больш жылля і тым самым ствараліся неабходныя бытавыя ўмовы для маладых выкладчыкаў і навуковых работнікаў. Гэта будзе ў значнай ступені садзейнічаць іх плённай вучэбнай і навуковай рабоце.

Дакладчык прааналізаваў работу прафкома па кантролю за дзейнасцю садова-агародніцкіх таварыстваў (САТ). Адзначаны шматлікія недахопы ў гэтай рабоце. Сходы таварыстваў праводзяцца нерэгулярна, праўленні таварыстваў слаба сочаць за ходам будаўніцтва садовых домікаў, на пасяджэннях праўленняў рэдка заслухоўваюць тых членаў, якія парушаюць патрабаванні статута таварыства. Прафсаюзны камітэт не ўстанавіў належнага кантролю за дзейнасцю САТ. Новаму саставу прафкома і адміністрацыі неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на гэта пытанне, рэгулярна заслухоўваць справаздачы праўленняў аб іх рабоце.

У справаздачны перыяд прафком і яго жыллёва-бытавая камісія ўдзялялі пастаянную ўвагу арганізацыі харчавання ў сталовых і буфетах ГДУ. Ёсць пэўныя зрухі ў станоўчы бок: адкрыта студэнцкае кафэ. У гэтым вялікая заслуга дацэнта І. В. Хадалевіч. Аднак трэба адзначыць, што прафком у поўнай ступені не дабіўся таго, каб ўсё было нармальна ў арганізацыі харчавання. Часта не працавалі буфеты па прычыне знаходжання буфетчыц у водпуску не летам, а восенню, у другім вучэбным корпусе буфет не працуе і зараз. Яшчэ маюць месца абважванні і аблікі наведвальнікаў у буфетах і сталовай ГДУ. Палепшыць трэба таксама асартымент і якасць страў. Абавязак прафкома — кантраляваць работу прадпрыемстваў харчавання, каб у будучым такіх парушэнняў не дапускалася.

БЯГУЧЫ год для прафсаюзнай арганізацыі быў асаблівым. У адпаведнасці з рашэннямі XVII з'езда прафсаюзаў краіны пачаўся абмен прафсаюзных білетаў. Гэтай падзеі ва універсітэце папярэднічала вялікая арганізатарская, падрыхтоўчая работа. У прафарганізацыях прайшлі прафсаюзныя сходы, на парадак дня якіх выносіліся пытанні абмену білетаў. Былі ў гэтай рабоце і недахопы. Прафкому неабходна ўважліва прааналізаваць вынікі першага этапа абмену білетаў і ўхіліць выяўленыя пралікі.

Асаблівую значнасць праводзімым цяпер справаздачам і выбарам, падкрэсліў дакладчык, прыдаў спецыяльны разгляд на пасяджэнні Палітбюро ЦК КПСС пытанняў аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з правядзеннем справаздач і выбараў у прафесіянальных саюзах. У адпаведнасці з пастановай Прэзідыума ВЦСПС адбыліся справаздачна-выбарныя сходы ў прафгрупах і цэхавых прафарганізацыях. Яны паказалі ўзрослую працоўную і грамадскую актыўнасць членаў прафсаюза. На большасці сходаў былі ўсебакова прааналізаваны дзейнасць прафбюро і прафгрупоргаў, ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў. Зноў абраным прафбюро, прафкому неабходна распрацаваць план мерапрыемстваў па выкананню крытычных заўваг і прапаноў, выказаных у ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі і пакласці іх у аснову дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць рабоце з кадрамі прафактыву. Яе трэба праводзіць мэтанакіравана, прыцягваючы ў прафактыў камуністаў.

Паспяховая работа прафсаюзных арганізацый па ўсіх напрамках дзейнасці, сказаў у заключэнне дакладчык, увага і клопаты аб людзях працы паслужаць далейшаму ўзмацненню іх уплыву ў працоўных калектывах, павышэнню іх ролі ў своечасовым ажыццяўленні планаў і сацыялістычных абавязацельстваў. І гэта будзе дастойным падарункам 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

---

## НОВЫ САСТАЎ ПРАФКОМА

**Ашыток М. К.** — шафёр АГЧ.
**Бабына У. П.** — дацэнт кафедры ўліку і статыстыкі (намеснік старшыні прафкома).
**Багамольнікава Н. А.** — супрацоўніца бібліятэкі.
**Баркоў У. А.** — загадчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання.
**Гадлеўская Г. М.** — асістэнт кафедры оптыкі.
**Дзядзічкіна Ж. А.** — медсястра санаторыя-прафілакторыя.
**Ермакоў У. Р.** — дацэнт кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу.
**Ігнатава М. У.** — загадчыца лабараторый эканамічнага факультэта.
**Каляда В. А.** — загадчык кафедры фізічнага выхавання (намеснік старшыні прафкома).
**Каўдэрка У. Э.** — дацэнт кафедры геафізікі.
**Кузьміч Л. П.** — асістэнт кафедры беларускай мовы.
**Мурашка М. Н.** — старшыня прафкома.
**Пенязь У. А.** — асістэнт кафедры вышэйшай матэматыкі.
**Парахня Т. М.** — малодшы навуковы супрацоўнік кафедры матэматычных праблем кіравання.
**Семянкоў А. М.** — загадчык лабараторый біялагічнага факультэта.
**Сальнікава Л. К.** — загадчыца аддзела бібліятэкі.
**Сыцько Н. У.** — тэхнік НДС.
**Трацэўскі Л. П.** — начальнік ІВЦ.
**Ягоранкаў М. І.** — загадчык праблемнай навукова-даследчай лабараторыі.

## НОВЫ САСТАЎ ПРЭЗІДЫУМА ПРАФКОМА

**Багамольнікава Н. А., Бабына У. П., Баркоў У. А., Каляда В. А., Мурашка М. Н., Пенязь У. А., Сыцько Н. У.**

## НОВЫ САСТАЎ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ

**Скорава А. А.** — дацэнт кафедры АМАЭІ (старшыня).
**Дзяменцьева Л. А.** — загадчыца канцылярыі.
**Жукава Т. М.** — старшы бухгалтар.
**Торап В. У.** — старшы навуковы супрацоўнік праблемнай навукова-даследчай лабараторыі.
**Фядосенка Л. В.** — старшы эканаміст НДС.

## ДЭЛЕГАТЫ НА XVII АБЛАСНУЮ ПРАФСАЮЗНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

**Гадлеўская Г. М., Мурашка М. Н., Сальнікава Л. К., Скорава А. А., Семянчук У. М.**



*Літаратурныя сустрэчы*

# ...І АЖЫЛІ ГЕРОІ ПЕСНЯРА

Даволі частай і вельмі прыемнай з'явай сталі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце літаратурныя сустрэчы. У вядучую вышэйшую навучальную ўстанову беларускага Палесся на іх прыязджаюць празаікі і паэты, драматургі і крытыкі, масцітыя мастакі слова і творчая моладзь. І кожная такая сустрэча пакідае прыкметны след у культурным жыцці калектыву ГДУ. Не стала выключэннем і апошняя, што адбылася гэтымі днямі. Яна была арганізавана кафедрай беларускай літаратуры і праўленнем абласнога таварыства аматараў кнігі і праходзіла ў рамках навукова-практычнай канферэнцыі па кнізе Алега Лойкі «Янка Купала» (серыя «Жыццё выдатных людзей»). На канферэнцыю прыехалі сам аўтар гэтага папулярнага твора і яго рэцэнзент—загадчык кафедры літаратуры Мінскага інстытута культуры, прафесар, член Саюза пісьменнікаў СССР М. М. Грынчык.

Незвычайным і памятным стаў пачатак канферэнцыі. Пад чаруючыя гукі народнай музыкі хлебам і соллю гасцей з беларускай сталіцы сустрэлі і правялі ў запоўненую студэнтамі і выкладчыкамі актавую залу шматлікія купалаўскія героі. У іх ролі выступалі самадзейныя акцёры Гомельскага ф а л ь клорна-этнаграфічнага тэатра «Жалейка» на чале з яго мастацкім кіраўніком і рэжысёрам Міколам Макарцовым.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў і цёпла павітаў гасцей і ўсіх прысутных дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта дацэнт М. Ф. Гуліцкі.

Пра новы высокамастацкі твор Алега Лойкі, яго выключнае навукова-пазнавaўчае значэнне расказаў загадчык кафедры беларускай літаратуры кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер.

«Янка Купала і беларуская літаратура»— тэма выступлення вядомага літаратуразнаўцы М. М. Грынчыка.

Пранікнёным і кранаючым было выступленне загадчыка кафедры беларускай мовы ГДУ прафесара У. В. Анічэнкі «Навучыўся я слоў беларускіх ад маці...», у якім вучоны вызначыў найбольш адметныя асаблівасці паэтычнага таленту Янкі Купалы.

Аб разнастайнасці і багацці мовы кнігі Алега Лойкі гаварыў загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства ГДУ прафесар П. У. Сцяцко.

Цёпла і шчыра дзяліліся сваімі думкамі аб творчай спадчыне аднаго з самых любімых беларускіх паэтаў — Янкі Купалы старшыня універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Крыніцы» Анатоль Казлоў і трэцякурсніца гісторыка-філалагічнага факультэта Наталля Падольская.

З неаслабнай увагай удзельнікі канферэнцыі слухалі выступленне прафесара кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна, аўтара кнігі «Янка Купала» Алега Лойкі. Ён захапляльна расказаў аб сваёй рабоце над гэтым творам, адказаў на шматлікія пытанні. У знак удзячнасці студэнты ўручылі Алегу Антонавічу кветкі.

Навукова-практычная канферэнцыя закончылася інсцэніроўкай «Свята на кірмашы» у пастаноўцы фальклорна-этнаграфічнага тэатра «Жалейка».

Літаратурная сустрэча па кнізе Алега Лойкі «Янка Купала» адбылася таксама ў Гомельскім сярэднім прафтэхвучылішчы № 126 народных мастацкіх промыслаў.

**Б. ВАЛОДЗІН.**



**НА ЗДЫМКАХ: 1. Алег Лойка з задавальненнем дае аўтографы ўдзельнікам навукова-практычнай канферэнцыі. 2. Фрагмент інсцэніроўкі «Свята на кірмашы» у пастаноўцы тэатра «Жалейка».**

Фота У. Чысціка, С. Матусевіч, В. Ермаковай.

ГЭТЫ дзень, 19 кастрычніка, запомніцца надоўга, як свята. Гукі жалейкі данесліся да ўсіх куткоў вучэбнага корпуса. Традыцыйнае — хлеб і соль... І незвычайнае: танцы пад народныя інструменты тут жа, ля ўвахода. Алег Лойка кружыцца ў танцы з дзяўчынай у народнай сукенцы. Здаецца, што ты апынуўся ў тым стагоддзі, калі пачынаў сваё жыццё Янка Купала, аб якім шмат чаго новага, цікавага даведаліся, мы, прачытаўшы кнігу Алега Лойкі «Як агонь, як вада»... Незвычайнае, бо незвычайная і кніга, якая стала першым творам пра беларуса, выдадзеным у серыі ЖЗЛ.

# СТУДЭНТЫ—АБ КАНФЕРЭНЦЫІ

**Вялікую карысць прынеслі студэнтам паведамленні аб дасканаласці мовы кнігі, аб яе багацці і прастаце. Хочацца выказаць словы ўдзячнасці за тое, што Алег Лойка падарыў чытачу магчымасць бліжэй пазнаёміцца з Я. Купалам — чалавекам, паэтам.**

**Уразіла выступленне самога аўтара — эмацыянальнага, няўрымслівага чалавека з добрай усмешкай. Ён адкрыў нам таямніцы творчай лабараторыі пісьменніка, расказаў аб сваёй працы над кнігай. Размовай сэрцаў можна назваць гутарку пісьменніка са студэнтамі.**

**В. БЫХАЎЦАВА,**
**студэнтка 3-га курса гістфіла.**

Канферэнцыя па кнізе Алега Лойкі «Янка Купала»— добры пачатак. Хацелася б, каб і ў далейшым такія сустрэчы працягваліся. Тым больш, што для нас, студэнтаў, гэта крыніца ведаў, пазнання. Шмат новага, дасюль невядомага, адкрылася перад намі. Больш глыбока давялося задумацца над роляй літаратуры ў жыцці чалавека. Вельмі прыемна, што пісьменнік растлумачыў чытачам мэту сваёй кнігі, даў добры кірунак для правільнага ўспрымання Купалы. І ўвогуле, выступленне самога даследчыка Алега Антонавіча дапамагло пазнаёміцца з тым шляхам, праз які давялося яму прайсці, перш чым убачылі мы ў кнігарнях і раман-эсэ «Як агонь, як вада...» і кнігу «Янка Купала».

**А. ПРАХАРЭНКА,**
**студэнт групы БР-13 гістфіла**

*Вучоныя — ГПТВ*

# З АДЗІНАЙ МЭТАЙ

На працягу некалькіх гадоў існуюць цесныя сувязі паміж гісторыка-філалагічным факультэтам ГДУ і Гомельскім сярэднім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчам № 126 народных мастацкіх промыслаў. Асабліва яны ўзмацніліся на этапе рэалізацыі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Прыкметна пашыраецца кантынгент студэнтаў, якія праходзяць у вучылішчы педагагічную практыку, дзе маюць выдатныя магчымасці трывала замацаваць набытыя тэарэтычныя веды.

У апошні час усё часцей адбываюцца сустрэчы вучоных універсітэта і выкладчыкаў-прадметнікаў вучылішча, сумесна абмяркоўваюцца найбольш важныя пытанні навучання і камуністычнага выхавання кадраў. Вядзецца таксама зацікаўленая размова аб больш паспяховым вывучэнні роднай мовы і літаратуры, па праблемах педагогікі, псіхалогіі, этыкі, аб падрыхтоўцы юнакоў і дзяўчат да высокапрадукцыйнай працы на вытворчасці і працягу іх вучобы ў ВНУ.

З бягучага навучальнага года ў вучылішчы створаны тэарэтычны семінар «Шляхі павышэння якасці вучэбна-выхаваўчай работы з навучэнцамі ў святле патрабаванняў «Асноўных напрамкаў рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы». З уводнай лекцыяй на ім выступіў загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ, прафесар, член-карэспандэнт АПН СССР І. Ф. Харламаў.

З вялікай карысцю прайшло ў вучылішчы і сумеснае пасяджэнне вучоных універсітэта і выкладчыкаў прадметнай камісіі гуманітарнага цыкла. Па сучасных праблемах педагагічнай навукі сваімі думкамі абмяняліся дырэктар вучылішча М. М. Воінаў, загадчык кафедры беларускай мовы, прафесар У. В. Анічэнка, загадчык кафедры беларускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер, іншыя ўдзельнікі пасяджэння.

**Б. ПАЎЛОВІЧ.**



**Гэты здымак быў зроблены ў час сумеснага пасяджэння вучоных універсітэта, гасцей з Мінска і выкладчыкаў прадметнай камісіі гуманітарнага цыкла прафтэхвучылішча № 126 народных мастацкіх промыслаў. Злева направа: кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ І. Ф. Штэйнер, загадчык кафедры літаратуры Мінскага інстытута культуры прафесар М. М. Грынчык, прафесар кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна, вядомы беларускі паэт і літаратуразнаўца, прафесар А. А. Лойка, загадчык кафедры беларускай мовы ГДУ прафесар У. В. Анічэнка, выпускнік аспірантуры ГДУ, дырэктар прафтэхвучылішча № 126 М. М. Воінаў.**

Фота А. Рудчанкі.

# НА МІЖНАРОДНЫМ ГЕАЛАГІЧНЫМ КАНГРЭСЕ

Сёлета ў жніўні нам пашчасціла ўдзельнічаць у рабоце XXVII сесіі Міжнароднага геалагічнага кангрэса (МГК), які праходзіў у Маскве.

За 106 гадоў гісторыі дзейнасці МГК — сусветнага форуму геолагаў — ён сабіраўся прыкладна раз у чатыры гады. Яго сесіі праходзілі ў 19 краінах. У 13 з іх Кангрэс збіраўся па аднаму разу, у 4 — па два і толькі Францыя і наша краіна ўдастойваліся гэтага гонару тройчы. Раней у нашай краіне адбылася VII (Пецярбургская) сесія 1897 г. і XVII (Маскоўская), якая была праведзена ў 1937 г. Кожная сесія МГК з'яўляецца этапнай для развіцця геалагічнай навукі.

У рабоце XXVII сесіі ўдзельнічала 5882 чалавекі з 112 краін свету.

Перад адкрыццём сесіі ў актавай зале Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава адбыўся сход савецкай дэлегацыі. На ім з інфармацыйнымі паведамленнямі выступілі Прэзідэнт Кангрэса міністр геалогіі СССР Е. А. Казлоўскі, віцэ-прэзідэнт АН СССР А. Л. Яншын, старшыня Нацыянальнага камітэта савецкіх геолагаў В. В. Меннер, генеральны сакратар Кангрэса М. А. Багданаў.

Урачыстае адкрыццё і закрыццё сесіі МГК адбылося ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

На першым пленарным пасяджэнні сярод іншых былі заслуханы даклады Е. А. Казлоўскага — «Геалогія ў народнай гаспадарцы СССР», В. П. Барсукова (СССР) і Г. Мазурскага (ЗША) — «Параўнаўчая планеталогія ў вывучэнні гісторыі Зямлі».

Заключнае пленарнае пасяджэнне прысвячалася геалагічным праблемам аховы навакольнага асяроддзя. Вялікую цікавасць выклікаў даклад акадэміка А. Л. Яншына «Эвалюцыя геалагічных працэсаў у гісторыі Зямлі».

На сесіі працавалі 22 секцыі, на якіх былі заслуханы і абмеркаваны даклады па ўсіх напрамках геалагічнай навукі.

У дні Кангрэса адбылася спецыяльная сесія па міжнароднай шматгадовай праграме «Літасфера». На секцыях МГК заслухана каля 2500, а разам з сімпозіумамі больш 3500 навуковых дакладаў і паведамленняў.

За час XXVII сесіі былі праведзены 92 нарады розных міжнародных геалагічных арганізацый.

Вялікую цікавасць выклікала Міжнародная выстаўка «ГЕАЭКСПО-84». На ёй дэманстраваліся дасягненні сусветнай геалагічнай навукі ў галіне геалагічнага картавання, пошукаў, разведкі і ацэнкі мінеральных рэсурсаў. Тут было прадстаўлена разнастайнае геалагічнае абсталяванне, геафізічныя прыборы і інструменты, паказваліся новыя метады і тэхнічныя сродкі аналітычных даследаванняў мінеральнай сыравіны як у лабараторыях, так і ў палявых умовах. У выстаўцы ўдзельнічала 134 прадпрыемствы і 160 фірм розных дзяржаў. За 10 дзён выстаўку наведала больш 25 тысяч удзельнікаў МГК і гасцей.

У павільёне «Геалогія» на ВДНГ СССР была адкрыта выстаўка «Выкарыстанне дасягненняў навук аб Зямлі ў вырашэнні народнагаспадарчых задач». Усе жадаючыя маглі наведаць вядучыя геалагічныя навуковыя арганізацыі і ВНУ Масквы і Ленінграда.

Для ўдзельнікаў Кангрэса дэманстраваліся таксама навуковыя і навукова-папулярныя фільмы па геалогіі, адлюстроўваючыя сучасны ўзровень развіцця навук аб Зямлі, розныя напрамкі і вынікі выкарыстання геалагічных ведаў у гаспадарчай практыцы. У поўнаметражных фільмах паказвалася дзейнасць Міністэрства геалогіі СССР і АН СССР. Глыбокае ўражанне зрабіў фільм аб жыцці і дзейнасці У. І. Вернадскага.

Па традыцыі да сесіі МГК і пасля яе былі арганізаваны шматдзённыя геалагічныя экскурсіі па тэрыторыі СССР, ВНР і ЧССР. У дні Кангрэса праводзіліся таксама кароткачасовыя геалагічныя экскурсіі. У іх прынялі ўдзел каля 2 тысяч чалавек з многіх краін свету. Яны азнаёміліся з геаграфіяй Крыма, Каўказа, Сібіры і іншых раёнаў СССР.

Дзейнасць XXVII МГК шырока асвятлялася ў сусветнай прэсе. Да яго адкрыцця былі апублікаваны і ўручаны удзельнікам навуковая праграма, тэзісы дакладаў і калёквіумаў. Рабоце Кангрэса былі прысвечаны спецыяльныя выпускі геалагічных часопісаў.

XXVII МГК падвёў вынікі развіцця геалогіі за апошнія чатыры гады. Як галоўная для геолагаў, пастаўлена задача забеспячэння чалавечага грамадства мінеральнай сыравінай і крыніцамі энергіі. Звернута ўвага на выключную важнасць аховы прыроды. Геалагічная служба здольна справіцца з пастаўленнымі задачамі. Але трэба ўлічваць, што этап лёгкадаступных і танных мінеральных рэсурсаў скончыўся. Цяпер трэба ісці ў глыбіню зямных нетраў, пачынаць здабычу карысных выкапняў у акіянах. Натуральна, патрэбны прынцыпова новыя падыходы і метады пошукаў і разведкі, новыя віды і генетычныя тыпы мінеральнай сыравіны. Разам з тым неабходна беражліва і эканомна расходваць гэту сыравіну, арганізаваць комплекснае яе выкарыстанне, павысіць каэфіцыент атрымання карысных кампанентаў.

На заключнай Генеральнай асамблеі Кангрэса быў прыняты «Зварот да геолагаў свету». Яго сэнс заключаецца ў тым, што людзям неабходна лепш спазнаць сваю планету, але для гэтага патрэбен мір на Зямлі.

**Г. КУЗНЯЦОЎ,**
прафесар,
**Л. МЯДЗВЕДЗЕЎ,**
дацэнт,
удзельнікі геалагічнага кангрэса.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**У лістападзе г. г. рэкамендуецца правесці палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:**

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**1. Сіла ідэй Кастрычніка** (да 67-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

Матэрыялы публікуюць усе газеты. Гл. таксама артыкул на гэту тэму ў часопісе «Политинформатор и агитатор», № 20 за 1984 г.

### ДА 40-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

**2. Рашаючы ўклад Савецкага Саюза ў перамогу над фашысцкай Германіяй і яе сатэлітамі.**

Матэрыял публікуе газета «Звязда». Гл. таксама матэрыял па гэтай тэме ў часопісе «Политическое самообразование», № 10 за 1984 г.

### II. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**3. Умацоўваць унутраны працоўны распарадак — задача агульная** (аб новых тыпавых правілах унутранага працоўнага распарадку для рабочых і служачых прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый).

Гл. матэрыялы, апублікаваныя ў «Экономической газете», № 43 1984 г.

### III. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

**4. Паслядоўная палітыка міру** (аб канструктыўных прапановах Савецкага Саюза ў галіне абмежавання ўзбраенняў і змяншэння ваеннай небяспекі).

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі і вывады, змешчаныя ў адказах К. У. Чарненкі на пытанні газеты «Вашынгтон пост» (Гл. «Правду» за 18 кастрычніка г. г.).

**5. Палітыка хлусні і паклёпу** (аб бесперспектыўнасці зламысных спроб імперыялістычнай прапаганды фальсіфікаваць дасягненні рэальнага сацыялізму ў развіцці дэмакратыі, узвесці паклёп на нашу дзяржаўную і палітычную сістэму, савецкі ўклад жыцця).

Матэрыял публікуе газета «Звязда». Гл. таксама артыкул на гэту тэму ў часопісе «Международная жизнь», № 10 за 1984 г.

**6. Капіталізм без прыкрас: навукова-тэхнічны прагрэс на службе антыгуманізму** (аб выкарыстанні імперыялістычнымі манаполіямі дасягненняў навукі і тэхнікі для ўзмацнення эксплуатацыі працоўных).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Коммунист Белоруссии», № 9 за 1984 г.

*БІБЛІЯТЭКА—ПЕРШАКУРСНІКУ*

# КНІГА—ВАШ СЯБАР

З пачаткам новага навучальнага года гасцінна расчыніліся дзверы лекцыйных залаў, аўдыторый, кабінетаў універсітэта. Сустрэла сваіх новых чытачоў, нядаўніх абітурыентаў, цяперашніх студэнтаў - першакурснікаў, універсітэцкая бібліятэка.

На працягу ўсіх гадоў навучання студэнтаў бібліятэка універсітэта прадастаўляе свае фонды ў іх распараджэнне А гэта больш 600000 экз. вучэбнай, навуковай, метадычнай, мастацкай літаратуры, перыядычных выданняў і выданняў на замежных мовах. 3 абанементы, 2 чытальныя залы, міжбібліятэчны абанемент, д а в едачна-бібліяграфічны аддзел, кабінетныя бібліятэкі маюць даведачны апарат, які дапамагае арыентавацца ў фондах бібліятэкі ў цэлым.

Студэнты біялагічнага, геалагічнага, матэматычнага, фізічнага факультэтаў і факультэта фізвыхавання атрымліваюць усю неабходную літаратуру на абанеменце № 1 (вул. Кірава, 119, аўд. 1-20), студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта — на аб. № 2 (вул. Савецкая 106), студэнты эканамічнага факультэта — на аб. № 3 (вул. Савецкая 104, аўд. 1-3).

Работнікі бібліятэкі да пачатку навучальнага года запісваюць першакурснікаў па спісах прыёмнай камісіі, рыхтуюць камплекты падручнікаў. Адразу ж па заканчэнні сельскагаспадарчых работ студэнты першых курсаў па графіку, складзенаму сумесна са старастамі акадэмічных груп, наведваюць свае абанементы, атрымліваюць білеты чытачоў і камплекты падручнікаў. Білет чытача — адзіны дакумент, па якому ён можа карыстацца ўсімі абанементамі, чытальнымі заламі і шматлікімі бібліятэкамі кабінетаў. Чытач павінен прад'яўляць яго пры кожным наведванні бібліятэкі. Забаронена перадаваць білет іншым асобам.

Абанементы бібліятэкі практычна поўнасцю забяспечваюць першакурснікаў вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай. Гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі кожны студэнт будзе беражліва і акуратна абыходзіцца з кнігамі, не забываць іх у аўдыторыях, гардэробе, калідорах інтэрнатаў і вучэбных карпусоў, не затрымліваць іх звыш вызначанага тэрміну. Кожны чытач павінен памятаць і разумець, што згубленая або затрыманая кніга пазбаўляе магчымасці выкарыстаць яе іншымі чытачамі. А на падручніках, якімі будуць карыстацца першакурснікі, вырасла не адно пакаленне спецыялістаў, у іх будуць мець патрэбу наступныя пакаленні. «Правілы карыстання бібліятэкай», з якімі абавязаны пазнаёміцца кожны пры наведванні абанемента, павінны стаць законам для ўсіх нашых чытачоў.

Бібліятэка праводзіць работу па вывучэнню інтарэсаў чытачоў і кіраўніцтву чытаннем студэнтаў-першакурснікаў. Распрацавана «Анкета вывучэння чытальніцкіх інтарэсаў студэнтаў і курса ГДУ» і пры першым наведванні студэнтамі абанементаў мы просім іх уважліва пазнаёміцца і акуратна запоўніць яе. Аналіз анкет дазваляе бібліятэкарам, замацаваным за акадэмічнымі групамі, і сектару ідэйна-выхаваўчай работы планаваць сваю дзейнасць.

На працягу ўсяго навучальнага года нашы чытачы маюць магчымасць наведваць тэматычныя кніжныя выстаўкі, а таксама штомесячныя выстаўкі-прагляды новых паступленняў, якія наладжваюцца ў корпусе № 2. Для студэнтаў-першакурснікаў будуць праводзіцца гутаркі, бібліяграфічныя агляды літаратуры. Нашы малодшыя курсы заўсёды з'яўляюцца добрымі памочнікамі ў арганізацыі чытальніцкіх канферэнцый, літаратурных вечароў, дыспутаў.

Спадзяёмся, што і сёлетнія першакурснікі стануць сапраўднымі сябрамі кнігі, памочнікамі і актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца бібліятэкай.

**Л. САЛЬНІКАВА**
**загадчыца аддзела абслугоўвання бібліятэкі ГДУ.**

# КОНКУРС НАЗВАЎ ЛЕПШЫХ

Падводзячы вынікі конкурсу «Ану, першакурснікі» эканамічнага факультэта, які праходзіў на мінулым тыдні, трэба адзначыць галоўнае: студэнты 1-га курса аднесліся да падрыхтоўкі конкурсу з усёй сур'ёзнасцю.

Першае месца заняла група 0-11. Разнастайнай была яе конкурсная праграма. Асабліва спадабаліся журы і гледачам народны і эстрадны танцы ў пастаноўцы студэнтак групы І. Франчук і В. Гаварыной. Група 0-11 таксама заваявала першынство ў конкурсе насценных газет.

Гумарыстычныя, вясёлыя праграмы прадставілі на конкурс студэнты груп 0-12 і Т-12. Іх цёпла ўспрынялі ў зале.

Адначасова трэба сказаць аб тым, што не ў меру магчымасцей выступілі на конкурсе студэнты групы Т-11. У выніку ім дасталося апошняе месца.

Лепшыя выканаўцы былі ўзнагароджаны граматамі. Гэта В. Ігнацьеў і М. Васюк з групы Т-13, якія праспявалі песні «Цёмная ноч» і «Чырвоныя макі». Лепшымі вядучымі ў конкурсе названы А. Цыбін (група Т-12) і С. Буката (група 0-12). Гарачымі апладысментамі зала сустрэла песні ў выкананні А. Андросіка (група Т-11).

Большасць конкурсных праграм насіла патрыятычны характар. Першакурснікі спявалі песні аб міры, барацьбе моладзі за недапушчэнне развязвання ядзернай вайны.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы конкурсу аказалі першакурснікам студэнты старэйшых курсаў эканомфака К. Барадзіна, А. Цяпугіна, А. Заяц, А. Санкоўскі, А. Лабачоў, А. Гелясаў.

Традыцыйны конкурс выявіў студэнцкія таленты. Цяпер — слова за імі. Неабходна, каб яны прымалі ўдзел у мастацкай самадзейнасці свайго факультэта, універсітэта.

Жадаем першакурснікам паспяхова выступіць на агульнауніверсітэцкім аглядзе студэнцкіх талентаў.

**Ірына НЕШЫК,**
**старшыня прэс-цэнтра эканамічнага факультэта, студэнтка групы Т-33.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, кафедра батанікі і фізіялогіі раслін, увесь калектыў біялагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту КІСЯЛЕВАЙ Ніне Сямёнаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
АЗ 51617
Заказ 3783